15. ГАБО. – Газета «Заря». – 1940 г. – № 194 (266).
16. ГАБО. – Ф. 2п. Оп. 1б. Д. 3.
17. ГАБО. – Ф. 279. Оп. 1. Д. 2.
18. ГАООГО. – Ф. 6195. Оп. 1. Д. 61
19. ГАООГО. – Ф. 6195. Оп. 1. Д. 407.
20. ГАБО. – Ф. 279. Оп. 1. Д. 9
21. ГАООГО. – Ф. 6195. Оп. 1. Д. 408.
22. ГАГО. – Ф. 127. Оп. 2. Д. 1м.
23. ГАГО. – Ф. 127. Оп. 2. Д. 1н.
24. ГАГО. – Ф. 127. Оп. 2. Д. 1о.
25. ГАГО. – Ф. 127. Оп. 2. Д. 1п.
26. ГАООГО. – Ф. 1285. Оп. 1. Д. 3.
27. ГАООГО. – Ф. 6196. Оп. 1. Д. 424.
28. ГАООГО. – Ф. 6195. Оп. 1. Д. 60.
29. ГАГО. – Ф. 126. Оп. 1. Д. 12.
30. ГАООГО. – Ф. 6195. Оп. 1. Д. 372.
31. ГАБО. – Ф. 1041. Оп. 1. Д. 1.
32. ГАБО. – Ф. 278. Оп. 1. Д. 5.

**(Дата подачи: 24.02.2023 г.)**

*А. Ф. Самусік*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск

*A. F. Samusik*
Belarusian State Economic University, Minsk

**УДК 37(476)(091)“14/15”**

# МОЛАДЗЬ З ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КРАКАЎСКАЙ АКАДЭМІІ Ў XV – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI СТ.

# YOUTH FROM THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN KRAKOW ACADEMIES IN THE XV – FIRST HALF OF THE XVI CENTURIES

*У артыкуле даследуецца праблема навучання моладзі з ВКЛ у Кракаўскай акадэміі ў XV – першай палове XVI ст. Адзначана недастатковая яе распрацаванасць у гістарыяграфіі. Акцэнтавана ўвага на складанасці падліку агульнай колькасці студэнтаў з ВКЛ, з-за спрэчнасці лакалізацыі іх паходжання. Пералічаны асноўныя айчынныя населеныя пункты, адкуль юнакі выязджалі на вучобу ў Кракаў. Разгледжаны выпадкі атрымання адукацыі ў акадэміі прадстаўнікамі правячай эліты ВКЛ (Гедройцы, Свірскія, Гальшанскія, Радзівілы). Вызначана сувязь знаходжання ў Кракаве студэнтаў-ліцвінаў з тэматычным афармленнем мясцовых выданняў шэрагу падручнікаў.*

*Ключавыя словы: адукацыя; Кракаўская акадэмія; Віленская кафедральная школа; побыт студэнтаў; навучанне магнатаў; падручнікі.*

*The article examines the problem of education of youth from GDL in Krakow Academy in the 15th – first half of the 16th centuries. It is noted that it is insufficiently developed in histori-*

*ography. Emphasis is placed on the difficulty of counting the total number of students from the Grand Duchy of Lithuania, due to the controversial location of their origin. The main domestic settlements from where young people went to study in Krakow are listed. The cases of receiving education at the academy by representatives of the reforming elite of the Grand Duchy of Lithuania (Gedroytsy, Svirskie, Galshanskie, Radzivily) are considered. The connection between the stay in Krakow of the students-lithuanians and the thematic design of local editions of a number of textbooks is determined.*

*Key words: education; Krakow Academy; Vilna Cathedral School; student life; magnate studies; textbooks.*

Заключэнне ў 1385 г. Крэўскай уніі аказала істотны ўплыў не толькі на далейшае палітычнае развіццё ВКЛ, але і на айчынную культуру, якая ў выніку актывізацыі каталіцкай царквы атрымала новыя вектары для свайго развіцця. Непасрэдным чынам датычылася гэта сферы адукацыі, дзе на працягу стагоддзяў існавалі толькі нешматлікія пачатковыя школы пры асобных праваслаўных храмах ды манастырах. Сітуацыя пачала змяняцца з канца XIV ст. калі ў Вільні была заснавана каталіцкая кафедральная школа. Дзякуючы яе дзейнасці тутэйшая вучнёўская моладзь засвойвала лацінскую мову ў аб’ёме дастатковым для навучання ў еўрапейскіх універсітэтах, што заклала ўстойлівую традыцыю замежных адукацыйных паездак [1, с. 271–272].

Найбольш папулярным месцам атрымання вышэйшай адукацыі стала Кракаўская акадэмія, створаная ў 1364 г. Прычым, акрамя самастойна выязджаючых сюды на вучобу юнакоў, былі і тыя каго ў старадаўню сталіцу Польшчы накіроўвалі ўлады Віленскага каталіцкага біскупства (1387), якім вельмі нехапала добрападрыхтаваных святароў. Кароль Уладзіслаў II (Ягайла) са свайго боку аказаў дапамогу такім выхаванцам, арганізаваўшы ў 1409 гг. пры тэалагічным факультэце акадэміі «ліцвінскую калегію» [2, с. 41–42].

Паездкі ў іншыя еўрапейскія асяродкі ўніверсітэцкай навукі (Прага, Балонья) ажно да другой трэці XVI ст. мелі адзінкавыя выпадкі, а таму менавіта Кракаў стаў тым месцам, дзе выхадцы з Беларусі пераважна ўдасканальвалі свае веды па сямі вызваленым навукам, філасофіі ды багаслоўю [3, с. 4]. Гэта прыярытэтная роля Кракаўскай акадэміі ў культурным развіцці ВКЛ у айчыннай гістарыяграфіі, у цэлым, асветлена. Разам з тым, адпаведныя даследаванні ўбачылі свет у сярэдзіне 1970-х гг. і іх аўтары (С. Александровіч ды Г. Галенчанка) абмінулі ўвагай цэлы шэраг адметных момантаў, звязаных з вучобай у Кракаве прадстаўнікоў айчыннай правячай эліты, лакалізацыяй паходжання некаторых айчынных студэнтаў і г. д. [4, с. 11–30; 5, с. 228–240] У наступныя дзесяцігоддзі дадзеная акадэмія згадвалася толькі ў кантэксце навучання ў ёй Ф. Скарыны, што істотна звузіла рамкі навуковага інтарэсу з комплекснага аналізу яе значэння для тагачаснай Беларусі да прыватнага выпадку навучання тут славутага земляка-асветніка [6, с. 26].

Дыскусійным з’яўляецца пытанне аб колькасці выхадцаў з ВКЛ, атрымаўшых адукацыю ў Кракаве ў разглядаемы час. Прычым гаворка заўсёды

вядзецца аб ураджэнцах беларускіх ды літоўскіх зямель, раздзяліць якіх немагчыма з-за адсутнасці адпаведнай інфармацыі, тады як студэнты, прыбыўшыя з Украіны лёгка адасабляюцца па геаграфічнаму прызнаку.

Згодна падлікам С. Александровіча, за 1433–1504 гг. у Кракаўскую акадэмію з ВКЛ прыехала 120 ліцвінаў, а за 1504–1550 гг. – 127. У суме гэта дае лічбу ў 247 чалавек. Аднак, ён прызнае: «навучалася там значна больш» [4, с. 13–17]. Прычым, згодна яму, першыя запісы наконт паходжання студэнтаў Кракаўскай акадэміі датуюцца 1433 г. На самой справе акадэмічны матрыкул пачынаецца з 1400 г. За першую трэць XV ст. у ім ёсць запісы наконт не менш чым пяць ураджэнцаў Беларусі: Мікалай сын Іагана з Любчы (1400), Якуб з Усялюба (1420), Якуб «Літвін» сын Мікалая з Ашмян (1426), Станіслаў сын Мікалая з Чачэрска (1427), Георгій, сын Давіда з Ліды (1427). Акрамя іх за азначаны час з Вільны прыбыла 16 чалавек, з Трокаў – 3, а яшчэ 3 былі запісаны проста з «Lithwania» без удакладнення населенага пункта [7, с. 14–74].

У сваю чаргу Г. Галенчанка прыводзіць крыху іншыя дадзеныя. Згодна яму, за ўсё XV ст. у Кракаве вучыўся 201 юнак з ВКЛ, а ў першай палове XVI ст. ён іх тут налічыў 173 (разам – 374 чалавека). Гэта надзвычай аптымістычная лічба, якая, аднак, не знаходзіць поўнага пацвярджэння ў матрыкулах Кракаўскай акадэміі. Найбольш спрэчным тут выглядае яго сцвярджэнне, што за 1530-я гг. сюды прыбыла ажно 52 студэнта з вялікакняскіх зямель, тады як у дакументах больш-менш бяспрэчна фіксуюцца прозвішчы 38 асоб – месцам адпраўлення тут указаны значныя населеныя пункты ВКЛ (Вільна, Ваўкавыск, Коўна і інш.) ці «Віленская дыяцэзія» [5, с. 232; 8, с. 250–297].

У цэлым, аналіз адпаведных запісаў у акадэмічных матрыкулах дазваляе аднесці да студэнтаў, паходзячых з тэрыторыі Беларусі і Літвы – 312 асоб, з якіх 154 чалавека паступіла сюда да 1499 г. уключна, а яшчэ 158 было залічана ў 1500–1551 гг. [7].

Азначаная розніца ў падліках у першую чаргу выклікана тым, што толькі з 1510-х гг. у акадэмічных матрыкулах на рэгулярнай аснове пачала ўказвацца родная дыяцэзія (біскупства) выхаванца. Пры гэтым шэраг айчынных населеных пунктаў у даследуемы час мелі падобныя па назве аналагі ў Польшчы ды Украіне. Так, дыскусійным з'яўляецца лакалізацыя студэнтаў з Брэста, адкуль ў Кракаў нават у пачатку XV ст. прыязджала больш моладзі чым з Вільны (з Брэста за 1400–1420 гг. – 8, а са сталіцы ВКЛ – 7). Больш верагодным месцам іх паходжання з'яўляўся горад у Куявах на поўначы Польшчы, дзе меўся касцёл са школай. Дакладна ж ураджэнцам айчыннага Брэста можна лічыць толькі Георгія сына Іагана (1492), бо ў яго запісу пазначана: «дыяцэзія Луцкая» [7, с. 14–45; 8, с. 16].

Праблематычна таксама і фіксацыя у матрыкулах айчынных палачан – з-за падабенства напісання іх роднага горада з Плоцкам у Мазовіі. Так, Ф. Скарына ў 1504 г. быў запісаны тут у якасці: «Franciscus Luce de Ploczko»

і толькі запіс аб наданні ў 1506 г. яму ступені бакалаўра больш дасканалы: «Fran. de Poloczko, Litphanus» [8, с. 91; 9, с. 144].

Падобная сітуацыя назіраецца і з Мінскам, дзе толькі Альберта сына Андрэя (1534) можна ўпэўнена лічыць выхадцам з тэрыторыі Беларусі, бо акрамя горада ў матрыкуле пазначана: «дыяцэзія Віленская». Астатніх жа з той жа падставай можна аднесці і да ўраджэнцаў Мінска-Мазавецкага (Познанская дыяцэзія). Выключэнне можна зрабіць з пэўнай доляй верагоднасці толькі ў дачыненні да Іагана сына Мацея (1502). У гэты год з ВКЛ у акадэмію прыехала яшчэ 8 ліцвінаў, згодна з разважаннямі С. Александровіча: «у далёкае падарожжа… студэнты з Беларусі і Літвы ехалі звычайна вялікай кампаніяй», а таму размяшчэнне яго імя на адной старонцы спіса з Іаганам сынам Мікалая з «Luthowia» ды Барталамеям сынам Марціна з Полацка можна прыняць за ўскосны доказ ліцвінскага паходжання гэтага студэнта [4, с. 14; 8, с. 77–78, 258, 272].

Большасць студэнтаў-ліцвінаў прыбывала ў Кракаў з Вільны – за ўвесь разглядаемы перыяд іх налічваецца 92 (70 за 1400–1499 гг. і 22 за 1500–1551 гг.). Прычым адносная нешматлікасць прыехаўшых са сталіцы ВКЛ у першай палове XVI ст. тлумачыцца тым, што значная частка тагачасных студэнтаў пачала ўказваць свае родныя вёскі, а не месца вучобы. Трэба таксама ўлічваць, што ў Вільні, акрамя кафедральнай школы, з 20-х гг. XV ст. існавала вучылішча пры мясцовым францысканскім кляштары [10, с. 133]. У 1426 г. у Кракаўскую акадэмію быў залічаны айцец Грыгорый (пазначаны ў якасці лектара дадзенай навучальнай установы), а ў 1538 г. – айцец Францыск [7, с. 63; 8, с. 290].

Вучнёўская моладзь з Трок накіроўвалася ў Кракаў толькі ў 1418–1485 гг. (10 чалавек), што, верагодна, з’яўляецца сведчаннем існавання тут каталіцкай школы. У сваю чаргу, з Коўна рэгулярныя адукацыйныя паездкі ажыццяўляліся з 1443 г. (11 за 1400–1499 гг. і 16 за 1500–1551 гг.), што таксама можна лічыць доказам наяўнасці ў горадзе каталіцкага асветніцкага асяродка. Абедзьве гэтыя навучальныя ўстановы былі актуальны для жыхароў тагачаснай Беларусі – асабліва яе паўночна-заходняй часткі, бо ў склад Віленскага ваяводства ўваходзілі Ашмянскі, Браслаўскі і Лідскі паветы, а ў складзе Троцкага ваяводства знаходзіўся Гродзенскі павет. Пры гэтым непасрэдна з Ашмян ды Гродна юнакі таксама адпраўляліся на вучобу ў Кракаў – 6 чалавек за 1426–1528 гг. і 7 чалавек за 1468–1549 гг. адпаведна. Гэта дало падставу польскаму даследчыку А. Карбавяку сцвярджаць аб наяўнасці ў іх уласных каталіцкіх школ [11, с. 93]. У цэлым, падобны прынцып вызначэння месца знаходжання рэгіянальных цэнтраў адукацыі можна браць за аснову. Так, з Полацка моладзь рэгулярна выязджала ў Кракаў у 1498–1509 гг. (7 чалавек), што ўскосна пацвярджае меркаванне А. Мальдзіса і Г. Галенчанкі аб існаванні тут у дадзены час школы пры бернардзінскім кляштары [12, с. 87; 6, с. 26].

У цэлым жа, пералік айчынных населеных пунктаў у матрыкулах Кракаўскай акадэміі вельмі вялікі і ахоплівае як гарады, так і мястэчкі з вёскамі: Ваверкі пад Лідай (1449), Валожын (1472, 1488), Варняны (1490), Ваўкавыск (1504, 1536, 1551), Вішня пад Пружанамі (1511), Віцебск (1517), Ворша (1483), Высокае (1459), Вялікая Ліпа пад Нясвіжам (1517), Геранёны (1468), Дварнова пад Полацкам (1532), Дзярэчын (1531), Доры пад Мінскам (1540), Дрысвяты (1528), Жалудок (1537), Жупраны (1512, 1531), Забалоцце пад Лідай (1528), Камянец (1546), Клецк (1477, 1507), Ліда (1427, 1445, 1522), Любча (1400), Маладзечна (1500), Мір (1548), Мядзель (1541), Пакровы пад Лідай (1522), Пінск (1464), Рэчыца (1506, 1510), Свір (1508), Слуцк (1504), Уселюб (1420), Чачэрск (1427) і інш. Стракатым было і сацыяльнае паходжанне асоб, якія адпраўляліся на вучобу за мяжу. Большасць тых, хто паходзіў з гарадоў, адносілася да мяшчанства, з мястэчак і вёсак – да шляхты. Да сярэдзіны XVI ст. студэнты-мяшчане складалі звыш паловы ад усіх, тады як шляхта – не больш трэці (часам прыязджалі і дзеці сялян) [4, с. 11–17, 29–30; 5, с. 233].

Пры такім раскладзе няма нічога дзіўнага ў тым, што Кракаўская акадэмія была даволі дэмакратычным месцам навучання, бо ажно да канца XV ст. студэнты са шляхетных сямей складалі тут усяго 25 % (сяляне да 10 %, а астатнія – мяшчане ды манахі) і толькі потым з-за ўвядзення абмежаванняў для збяднелых выхаванцаў іх колькасць узрасла да 50 %. Агульны для ўсіх уступны ўзнос складаў 8 гр. польскіх. Яшчэ 6 гр. польскіх плацілася сеньёру бурсы за месца. Начлег і харчаванне каштавалі 2 гр. штотыдзень (найбольш збяднелых вызвалялі ад аплаты). Штрафамі каралася парушэнне моўнага рэжыму (ужывацца павінна была выключна лацынь) ды дысцыпліны (спазненні, бойкі, п’янкі, крадзяжы і інш). Зносіны з жанчынамі забараняліся: «Святы Аўгусцін кажа, што мужчына, адданы навуцы, не павінен мець ніякіх спраў з жанчынамі… жанчына горш за змяю і скарпіёна, бо атручвае душу мужчыны…». Каб аплаціць усе выдаткі на вучобу ды штрафы, менш заможныя студэнты наймаліся да высакародных аднакурснікаў, а таксама працавалі хатнімі настаўнікамі, шаўцамі, абслугай у харчэўнях, музыкамі, перапісчыкамі і афарміцелямі (малявалі мініяцюры) кніг, наймаліся ганцамі ў іншыя краіны і г. д. Часам пазбегнуць штрафа можна было дзякуючы поспехам у вучобе. Так, у 1513 г. траіх студэнтаў-ліцвінаў абавязалі выплаціць па капе грошаў (60 гр.) за зневажанне польскіх студэнтаў. Але аказалася, што столькі грошаў яны не маюць, жывуць у бурсе для збяднелых выхаванцаў, а прафесары далі ім станоўчую характарыстыку і ў выніку рэктар адмяніў пакаранне [4, с. 13–21; 13, с. 101–104].

Аднак, новы светапогляд пранікаў і ў асяроддзе правячай эліты. Праявіўся ён у разуменні важнасці добрай адукацыі, якая здольна прынесці карысць дзяржаве. Клопатам аб грамадскім дабрабыце можна растлумачыць той факт, што ўжо ў XV ст. у спісе фундатараў Кракаўскай акадэміі

значыліся віленскі кашталян М. Кезгайла і віленскі ваявода Я. Гаштольд [5, с. 234].

Часцяком у студэнцкім асяроддзі Кракава аказваліся і прадстаўнікі правячай эліты ВКЛ. Першым з яе ліку ў акадэмію паступіў у 1461 г. Міхал з кн. Гедройцаў (у 1465 г. атрымаў ступень бакалаўра тэалогіі) – ён уступіў у ордэн аўгусцінцаў і з'яўляўся прызнаным прадказальнікам ды цудатворцам (у 2018 г. беатыфікаваны ў Рыме) [14, с. C2r-F3r]. У 1476 г. сюды быў залічаны Андрэй Петкавіч з роду кн. Свірскіх (у 1478 г. атрымаў ступень бакалаўра тэалогіі), які ў далейшым стаў канонікам віленскім і пробашчам варнянскім. У 1488 г. у акадэмічным матрыкуле згаданы Януш сын Аляксандра Гальшанскага «князя з Літвы», які ў далейшым стаў крайчым вялікім ВКЛ і займаў пасады намесніка скідзельскага ды старосты слонімскага. Праз два гады тутэйшым студэнтам стаў Станіслаў сын кн. Паўла (Пашко) Гедройца. У 1504–1507 гг. на філасофскім факультэце вучыўся будучы віленскі біскуп Павел з роду кн. Гальшанскіх. Гэта малодшы брат згаданага вышэй кн. Я. А. Гальшанскага. У матрыкуле князь Павел праходзіў у якасці нашчадка «князя Аляксандра Гродзенскага». Гэта недакладна скарочаны запіс тытулаў бацькі высокароднага студэнта, якімі ён карыстаўся ў Кракаве. У поўным аб'ёме яны адзначаны ў прысвечанай яму кнізе мясцовага прафесара Яна са Стабніцы «Дзіця прыроднай філасофіі» (1507), дзе ён найменаваўся сынам «князя Аляксандра Гальшанскага кашталяна Віленскага і капітана Гродзенскага (з 1488 г. намеснік гродзенскі. – *А. С.*)». Азначаны прафесар выкладаў яму філасофію па І. Дунсу Скоту і адзначаў высокія поспехі свайго падапечнага. Пасля завяршэння навучання Павел Гальшанскі ў 1507 г. стаў біскупам луцкім. З 1515 г. ён займаў месца прэлата-архідыякана касцёла св. Станіслава ў Вільні і адказваў за выхаванне Жыгімонта II Аўгуста. Віленскае ж біскупства ўзначаліў у 1536 г. [15, с. 67, 101–104, 508].

У 1534 г. сюды паступіў адзін з Радзівілаў. Запіс у матрыкуле акадэміі паведамляе, што «Nicolaus Radzyvil» прыбыў з: «districtu Przelagensi Lithvanus dioc. Vilnensis» [8, с. 274]. Гаворка можа ісці толькі пра будучых канцлераў ВКЛ кн. М. Радзівіла Чорнага альбо яго стрыечнага брата кн. М. Радзівіла Рудага. Вядома, што яны абодва ведалі латынь, польскую і рускую (старабеларускую) мовы. Таксама цалкам верагодна іх прысутнасць у азначаны час у Кракаве, дзе высокародныя юнакі шмат часу праводзілі пры каралеўскім двары. Польскі гісторык Г. Лулевіч ставіць пад сумнеў меркаванне, што гаворка ў матрыкуле ідзе аб кн. М. Радзівіле Чорным [16, с. 336]. У сваю чаргу, літоўская даследчыца Р. Рагаўскіене адвяргае магчымасць навучання ў акадэміі кн. М. Радзівіла Рудага. Так ці інакш, але пачатак вайны з Маскоўскай дзяржавай (1534–1537) прымусіў іх абодвух вярнуцца на Радзіму ды ўступіць у войска [17, с. 29–31].

Адметным сведчаннем таго, што колькасць ліцвінаў у Кракаве ў першай палове XVI ст. была адчувальнай, з'яўляецца рэгулярнае змяшчэнне

мясцовымі выдаўцамі на вокладках сваіх кніг вучэбнага характару поруч з гербамі Польшчы ды Кракава яшчэ і дзяржаўнага сімвалу ВКЛ. Можна меркаваць, што такім чынам яны спадзяваліся пашырыць кола сваіх пакупнікоў, а таму ішлі на дадатковыя выдаткі па афармленню тытульнных лістоў. Прычым, паступалі такім чынам практычна ўсе тагачасныя выдаўцы: І. Галер у 1503 г., У. Каўм у 1515 г. ды Ф. Унглер у 1523 г. адпаведным чынам аздобілі «Граматыку» Э. Даната; К. Хохфедэр у 1503 г. – дапаможнік па эпісталаграфіі Ф. Нігра; І. Галер у 1510 г. – каментарыі да «Фізікі» Арыстоцеля Я. Фабэра Стапуленсіса; Г. Віетор у 1525 г. – падручнік па курсу паэтыцы У. Гутэна і інш. [18, ч. 3, т. 4, с. 284–285; т. 5, с. 149; т. 6, с. 175, 177; т. 7, с. 322; т. 12, с. 153–154].

Азначаная навучальная літаратура пашыралася і на тэрыторыі Беларусі, куды таксама рэгулярна вярталіся асобы, атрымаўшыя адукацыю ў Кракаўскай акадэміі. Разам гэта дазваляла паступова павялічваць колькасць асветніцкіх асяродкаў ды ўздымаць узровень пісьменнасці мясцовага грамадства. Такое развіццё падзей цалкам адпавядала гуманістычным ідэям эпохі Адраджэння ды падрыхтавала глебу для значнага ўздыму поліканфесійнай школьнай справы ў другой палове XVI ст.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Kurczewski, J.* Biskupstwo Wilenskie od jego zalozenia az do dni obecnych, zawierajace dzieje i prace biskupow i duchowienstwa djecezji Wilenskiej, oraz wykaz kosciolow, klasztorow, szkol i zakladow dobroczynnych / J. Kurczewski. – Wilno: Druk. J. Zawadzkiego, 1912. – 614 s.

2. *Jaroszewicz, J.* Obraz Litwy pod względem jéj cywilizacyi, od czasow najdawniejszych do końca wieku XVIII: w 3 cz. / J. Jaroszewicz. – Wilno: Druk. M. Romma, 1844–1845. – Cz. 2: Litwa w piérwszych trzech wiekach po przyięciu wiary chrześciańskiéj. – 1844. – II, 313 s.

3. *Самусік, А. Ф.* Станаўленне адукацыйнай справы на беларускіх землях ў XIV – сяр. XVI ст. / А. Ф. Самусік // Весці Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. – Серыя 2. – 2008. – № 4. – С. 3–7.

4. *Александровіч, С.* Кнігі і людзі. Зб. літаратурна-крытычных арт. / С. Александровіч. – Мінск: Маст. літаратура, 1976. – 208 с.

5. *Голенченко, Г. Я.* Студенты Великого княжества Литовского в Краковском университете XV–XVI вв. / Г. Я. Голенченко // Культурные связи народов Восточной Европы в XVI веке / под ред. Б. А. Рыбакова. – М.: Наука, 1976. – С. 228–240.

6. *Мальдзіс, А. І.* Францыск Скарына як прыхільнік зближэння і ўзаемаразумення людзей і народаў / А. І. Мальдзіс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988. – 33 с.

7. Album studiosorum Universitatis Cracoviensis: in 5 vol. / Ż. Pauli, B. Ulanowski, A. Chmiel. – Cracoviae: Universitatis Jagellonicae, 1887–1956. – V. 1: Ab anno 1400 ad annum 1489. – 1887. – XI, 294 p.

8. Album studiosorum Universitatis Cracoviensis: in 5 vol. / Ż. Pauli, B. Ulanowski, A. Chmiel. – Cracoviae: Universitatis Jagellonicae, 1887–1956. – V. 2: Ab anno 1490 ad annum 1551. – 1892. – 347 p.

9. *Muczkowski, J.* Statuta nec non liber promotionum philosophorum ordinis in universitate studiorum Jagellonica ab anno 1402 ad annum 1849 / J. Muczkowski. – Cracoviae: Typis Universitatis, 1849. – CCXL, 562 s.

10. *Слюнькова, И. Н.* Монастыри восточной и западной традиций. Наследие архитектуры Беларуси / И. Н. Слюнькова. – М.: Прогресс-Традиция, 2002. – 600 с.

11. *Karbowiak, A.* Dzieje wychowania i szkól w Polsce: w 3 t. / A. Karbowiak. – Lwów – Warszawa – Kraków: Wyd-wo zakładu narodowego im. Ossolińskich, 1923. – T. 3. – 1923. – 564 s.

12. *Галенчанка, Г. Я.* Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар / Г. Я. Галенчанка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 280 с.

13. *Muczkowski, J.* Mieszkania i postępowanie uczniów krakowskich w wiekach dawniejszych / J. Muczkowski. – Kraków: Nakł. i czcionkami J. Czecha, 1842. – VI, 158 s.

14. *Jan z Trzciany.* Zywot błogosławionego Michała Gedrocia xiążęćia litewskiego zakonnika S. Rządu Kanonikow BB. Martyrum de Poenitentia od Demetriusa Rzymianina tamże w Rzymie napierwszego fundatora y patryarchy postanowionego, ktorego ciało odpoczywa w Krakowie w kościele S. Marka, z oryginału własnego wyięty / Jan z Trzciany. – Kraków: Druk. S. Kempini, 1615. – 38 k.

15. *Wolff, J.* Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku / J. Wolff. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1895. – XXV, 698 s.

16. *Lulewicz, H.* Radziwiłł Mikołaj zwany Czarnym / H. Lulewicz // Polski Słownik biograficzny. – Warszawa; Kraków: Wyd-wo PAN, 1987. – T. XXX. – S. 335–347.

17. *Ragauskienė, R.* Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės kancleris Mikalojus Radvila Rudasis (apie 1515–1584 m.) / R. Ragauskienė. – Vilnius: Valstybės žinios, 2002. – 447 p.

18. *Estreicher, K.* Bibliografia polska: w 4 cz.; 37 t. / K. Estreicher, S. Estreicher. – Kraków: Druk. Uniwersytetu Jagiellońskiego, 1870–1939. – Cz. 3: Stólecie XV–XVIII w układzie abecadłowym. – T. 4. – 1897. – VIII, 475, V s.; T. 5. – 1898. – 377, XXXIV s.; T. 6. – 1899. – 491, V s.; T. 7. – 1901. – 705, VI s.; T. 12. – 1910. – 545, XLIII s.

**(Дата падачы: 17.02.2023 г.)**

*І. А. Саракавік*
Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Мінск

*I. A. Sorokovik*
Presidential Academy of Management Republic of Belarus, Minsk

**УДК 94:340(476)**

# АДМЕТНАСЦІ РАЗВІЦЦЯ АКАДЭМІЧНАЙ ЮРЫДЫЧНАЙ НАВУКІ Ў ПЕРШЫЯ ГАДЫ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: ГІСТОРЫКА-ПРАВАВЫ ЗРЭЗ

# FEATURES OF THE DEVELOPMENT OF ACADEMIC LEGAL SCIENCE IN THE FIRST YEARS OF INDEPENDENCE OF THE REPUBLIC OF BELARUS: HISTORICAL AND LEGAL CROSS-SECTION

*Артыкул прысвечаны адметнасцям развіцця акадэмічнай юрыдычнай навукі ва ўмовах, калі распаўся Савецкі Саюз і была абвешчана суверэннасць Рэспублікі Беларусь, калі юрыдычна не стала савецкага грамадска-палітычнага ладу і былі зроблены першыя крокі па ўсталяванні новага.*